**Імя прафесара Мар'яна Пакропка з Варшавы — этнолага, знаўцы польскага народнага мастацтва, добра вядомае на Беларусі не толькі па яго грунтоўных манаграфіях. Неаднойчы прафесар быў госцем і членам журы на фальклорных фестывалях у Пінску і Гродне, на "Славянскім базары ў Віцебску", дзе ён таксама паказаў выстаўку са збораў свайго прыватнага музея — "Юдаіка ў польскім народным мастацтве".**

# Беларусь і Літва ў Атрэмбусах пад Варшавай



**Йонас Рудзінкас і Мар'ян Пакропак адкрываюць выстаўку.**

Для свайго вялізнага і па ацэнках экспертаў вельмі каштоўнага збору народнага жывапісу і драўлянай скульптуры Мар'ян Пакропак пабудаваў уласнымі сіламі ў Атрэмбусах пад Варшавай асобны павільён. Гэта першы ў суседняй краіне прыватны музей, статус якога пацверджаны Міністэрствам культуры Польшчы. З 1996 г. тут экспануецца не толькі яго ўласная калекцыя, але і часовыя выстаўкі сучаснага народнага мастацтва. За гэты час сямейны музей, весці справы ў якім прафесару дапамагаюць яго жонка пані Станіслава, сын Войцех і дачка Агнешка, наладзіў больш за 30 выставак, у тым ліку перасовачных. Выстаўка "Польская народная выцінанка" са збору Мар'яна Пакропка дэманстравалася летась у Кіеве і іншых гарадах на Украіне.



**Беларуская экспазіцыя выстаўкі.**

Некалькі гадоў запар прафесар рыхтаваўся да выстаўкі, якая адкрыта ў яго музеі зараз. Выстаўка "Сучаснае народнае і інсітнае мастацтва з былых земляў Вялікага княства Літоўскага" рэпрэзентуе сучасную творчасць народных майстроў і мастакоў розных нацыянальнасцей: палякаў, беларусаў, літоўцаў. Калекцыю сучасных твораў сваіх майстроў прадставіў на выстаўку Саюз народных творцаў Літвы: жывапіс, разьба па дрэве, кераміка, кавальскія і ювелірныя вырабы з бурштыну, тканыя паясы. Літоўская частка экспазіцыі дапоўнена цудоўным і рэдкім зборам віленскіх дзіцячых конікаў-качалак, якія прафесар на працягу многіх гадоў набываў на Казюку — традыцыйным кірмашы народных вырабаў у Вільні. У беларускі раздзел выстаўкі ўвайшлі карціны, драўляныя скульптуры, вырабы з саломкі і выцінанкі. Тут прадстаўлена кампазіцыя "Каляднікі" вядомага майстра драўлянай паліхромнай скульптуры Івана Супрунчыка са Століншчыны, якая дзесяць гадоў таму паклала пачатак беларускай калекцыі гэтага музея. У 1994 г. на Міжнародным фальклорным фестывалі ў Пінску Мар'ян Пакропак пазнаёміўся з гэтым таленавітым майстрам і закахаўся ў яго шчырыя і надзвычай індывідуальныя па манеры выканання творы. На выстаўцы можна таксама пазнаёміцца з карцінамі інсітных мастакоў з Віцебска — Фёдара Максімава, Мікалая Байцова, Сайфугалііевай. Высока ацэнены наведвальнікамі выстаўкі, сярод якіх заўсёды шмат супрацоўнікаў этнаграфічных музеяў, мастацтвазнаўцаў, выцінанкі Станіслава Муліцы з Гродна. Майстар параўнальна нядаўна захапіўся гэтым відам мастацтва, але здолеў знайсці ў ім свой індывідуальны стыль. Адкрыццём вернісажу сталі і графічныя працы другога гродзенскага мастака — Аляксандра Аўчыннікава. Да гэтага часу ён быў вядомы толькі сваімі выцінанкамі, але, дзякуючы настойлівасці М.Пакропка, упершыню паказаў свае аркушы, выкананыя пастэллю.

На вернісажы ў музеі ў Атрэмбусах у Мар'яна Пакропка было шмат гасцей. Здолела прыехаць на адкрыццё выстаўкі суполка гродзенскіх рамеснікаў і народных майстроў пры "Саюзе палякаў Беларусі", якую ўзначальвае С.Муліца. Яны "ўганаравалі" прафесара саламяным капелюшом. Другі прадстаўнік удзельнікаў выстаўкі — старшыня Саюза народных творцаў Літвы Іонас Рудзінскас у знак пашаны перавязаў Мар'яна Пакропка традыцыйным тканым поясам-стужкай. Усе прысутныя былі згодныя з тым, што ідэя супольнай выстаўкі народнага мастацтва палякаў, беларусаў і літоўцаў, якая як прыватная ініцыятыва рэалізавана ў Музеі народнага мастацтва ў Атрэмбусах, вартая таго, каб знайсці дзяржаўную падтрымку ў Польшчы, Беларусі і Літве.

**Вольга ЛАБАЧЭЎСКАЯ**
**Фота аўтара**

---

жысуры тэатра лялек("Адвечная песня" Я.Купалы, педагогі курса А.Ляляўскі і І.Юр'ева). Да нашых тэатраў далучылася экспазіцыя лялек з фондаў музея тэатра С.Абразцова з Масквы.

У межах гэтага, як высветлілася, трыумфальнага шэсця беларускіх лялечнікаў адбыўся "круглы стол" па ініцыятыве Харвацкага цэнтра UNIMA , прысвечаны беларускай лялечнай школе і прафесійнаму мастацтву беларускага тэатра лялек.

Гучны поспех у гледачоў, поўныя захаплення водгукі ў прэсе, і, як заканамерны вынік, рашэнне міжнароднага журы: Гран-пры атрымала "Загубленая душа", чатыры асобныя прызы за рэжысуру сваёй курсавой "Адвечнай песні" атрымалі студэнты А.Ляляўскага. Асобныя прызы за анімацыю і акцёрскае майстэрства атрымалі Алег Жугжда, Ларыса Мікуліч("Гарбата на дваіх") і сусветна вядомы Джым Гэмбл са Злучаных Штатаў Амерыкі за сваё шоу "Чароўны свет лялек".

Нашы лялькі зрабілі ўсё, каб нашу краіну добра запомнілі ў Харватыі.

Не толькі спартсмены, але і лялькі таксама працуюць на імідж нашай Беларусі.

**А.В.**
**Гродна**